УДК 882.6-09 +378. 01

Т. М. Федарцова, канд. філал. навук

# ПРАФЕСІЙНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ ВЫДАЎЦА І ЯЕ ФАРМІРАВАННЕ ПРАЗ ДЗЕЙНАСЦЬ ГУРТКА ПАГЛЫБЛЕНАГА ВЫВУЧЭННЯ ЛІТАРАТУРЫ «СПАДЧЫНА»

The article presents the exsperience of work on the problem of profound study of literature in a student scientific groun.

Ідэя стварэння на факультэце ВСіП гуртка «Спадчына» нарадзілася з той нагоды, што ў сістэме сучасных літаратуразнаўчых тэхналогій узнік новы ўзровень функцыянавання паняццяў: вечны вобраз – архетып, скразная тэма – топік, скразная ідэя – канцэпт і г. д. Але ў падручніках гэтыя, ды і іншыя дакладна акрэсленыя азначэнні не былі яшчэ зафіксаваны. Да гэтага часу не створаны добры падручнік па паэтыцы жанраў беларускай паэзіі, а для будучага выдаўца важна ведаць жанрава-стылёвыя асаблівасці кожнага твора. Ды і ў айчынную літаратуру актыўна вярталіся несправядліва забытыя імёны аўтараў і іх творы. Таму з самага пачатку дзейнасць гуртка вызначалася як асветніцкая.

Першы год працы, які завяршыўся студэнцкай навукова-асветніцкай канферэнцыяй «Я ў Радзіме душою разліўся», прысвечанай 200-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча, паказаў, што межы кампетэнцыі гуртка трэба значна пашырыць, а яго дзейнасць будаваць згодна з сучаснымі методыкамі і тэхналогіямі. Пайшлі следам за сёняшняй канцэпцыяй літаратурнай адукацыі, якая прадугледжвае параўнальны аналіз з аналагічнымі працэсамі і з'явамі ў сусветнай літаратуры. Студэнтам-гуртkоўцам было прапанавана зрабіць аналіз рамана А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» і падаць яго ў параўнанні з раманам чэшскага пісьменніка Я. Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў час сусветнай вайны», п'есай знакамітага французскага драматурга, аднаго з заснавальнікаў мадэрнісцкага «тэатра абсурду» Эжэна Іанескі «Насарог» і п'есай Самуэла Бекета «У чаканні Гадо». Драматургія Францішка Аляхновіча (яго «новая драма») разглядалася ў кантэксце творчасці такіх знакамітых майстроў драматургічнага жанру, як Генрык Ібсэн, Марыс Метэрлінк, Бернард Шоу, Герхарт Гаўптман, Юхан Аўгуст Стындберг і іншыя. Разглядаюцца таксама проза, паэзія, літаратурная крытыка. Так у працы гуртка актыўна праявіліся элементы кампаратывістыкі – аспекты параўнальнага вывучэння набыткаў многіх міжнацыянальных літаратур свету.

Трэці год дзейнасці гуртка быў адзначаны актуальнай пошукавай тэмай «Вывучэнне беларускай літаратуры за мяжой». Студэнты ў сваіх шматлікіх творчых працах адзначылі, што цікавасць да беларускага мастацкага слова пастаянна праяўлялася і праяўляецца ў іншых краінах свету. Яшчэ ў XII стагоддзі ў Візантыі былі перакладзены псалмы і малітвы Кірылы Тураўскага, якімі і па сённяшні дзень карыстаецца ўвесь хрысціянскі свет. У Італіі добра вядомыя і ўключаны ў абсяг тамтэйшых курсаў замежнай літаратуры паэмы «Песня пра Зубра» Міколы Гусоўскага і «Пруская вайна» Яна Вісліцкага.

У раздзеле «Вядомыя перакладчыкі свету» вывучаецца творчасць Уладзіміра Скарынкіна, які пераклаў на беларускую мову «Боскую Камедыю» Дантэ Аліг'еры, Анатоля Вярцінскага і Пятра Макаля (пераклалі на беларускую мову п'есы Лопе дэ Вегі). Тым больш, што гэтыя і іншыя творы беларускага Рэнесансу падрабязна разглядаюць ў сваіх навуковых працах сучасныя англійскія даследчыкі Пітэр Бэрк і прафесар Лонданскага універсітэта Арнольд Макмілін, які выдаў у Англіі даследаванні беларускай літаратуры па ўсіх перыядах яе існавання, адно з якіх («Беларуская літаратура ў 50–60-я гг. XX ст.») перакладзена з англійскай мовы і выдадзена ў 2001 г. у айчынным выдавецтве «Беларускі кнігазбор». Гэта грунтоўная энцыклапедыя гісторыі нашай паэзіі, прозы, драматургіі. У ЗША створаны і дзейнічае Інстытут культуры і мастацтва, у якім належнае месца надаецца аналізу літаратурнага працэсу на Беларусі, пастаянна і безупынна вядуцца навуковыя даследаванні нашага прыгожага пісьменства.

Гуртkоўцы адзначалі той факт, што Чэхія, Польшча, Балгарыя, Украіна, Англія, Францыя, Італія, Германія, Скандынаўскія краіны і інш. зацікаўлена ставяцца да нашай літаратурнай спадчыны. Бо толькі верш Янкі Купалы «А хто там ідзе» перакладзены на 80 моў свету. А творчасць М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, У. Караткевіча, А. Разанава дасканала даследуецца ў Англіі, Балгарыі, Францыі, Італіі, Чэхіі, Польшчы, Германіі і інш. Напрыклад, пазнавальны, карысны і цікавы матэрыял па вывучэнні творчасці Васіля Быкава ў іншых краінах свету зрабіла (цяпер ужо выпускніца) Таццяна Бурая. У прыватнасці, яна адзначыла, што, паводле звестак ЮНЕСКА, напрыканцы 70-х гг. XX ст. Васіль Быкаў быў прызнаным самым вядомым пісьменнікам свету. Яго творы перакладзены больш як на пяцьдзесят замежных моў, у тым ліку на італьянскую, францyз-

скую, англійскую, іспанскую, японскую, нямецкую і інш. Разнастайныя творы знакамітага празаіка выдаваліся ў Фінляндыі, Варшаве, Празе, Сафіі, Мілане, Каіры, Лондане, Парыжы і ў іншых краінах. Цікавае і грунтоўнае паведамленне паводле пошукавай навуковай працы было заслухана не толькі на пасяджэнні гуртка, але і ў акадэмічных групах пад час знаёмства з творчасцю знакамітага пісьменніка.

Па меры павелічэння колькасці жадаючых прымаць удзел у творчай працы наспела неабходнасць структурна ўпарадкаваць гурток, распрацаваць шырокую праграму яго дзейнасці. Таму з верасня 2002 г. існуе трохузроўневая сістэма працы. Пачаткоўцы (студэнты першага курса) на занятках гуртка больш шырока знаёмяцца з літаратуразнаўчай тэрміналогіяй, вучацца працаваць з навуковай літаратурай. Пішуць рэфератыўныя працы па тэмах, абраных для даследавання.

Часам тэма можа быць і калектыўнай. Напрыклад, пры знаёмстве з творчасцю Анарэ Бальзака студэнты сёмай групы 2-га курса прапанавалі стварыць сучасную «Камедыю нораваў». Так у актыве гуртка з'явіліся арыгінальныя творы на маральна-этычную тэматыку. Гэта байка пра плеткароў Сняжаны Дзянішчык, гумарэскі, замалёўкі, нататкі Кацярыны Амельяновіч, Марыны Якаўлевай, Вікторыі Пачкоўскай, Ірыны Крук і інш.

Псіхалагічна важным фактарам з'яўляецца аналіз атрыманых вынікаў. Ён праводзіцца публічна (на пасяджэнні гуртка) ці пры ўдзеле «экспертаў» і індывідуальна (разгляд кожнай працы разам з выкладчыкам). Публічны аналіз рыхтуе група «экспертаў», створаная са студэнтаў старэйшых курсаў, якія займаюцца блізкароднаснымі праблемамі. Напрыклад, начаткі даследавання станаўлення і развіцця беларускай элегіі былой першакурсніцы Наталлі Райчонак разглядала група студэнтаў чацвёртага курса, якую ўзначальвала Вольга Шамкуць. А зараз трэцякурсніца Наталля Райчонак узначальвае групу «экспертаў» па даследуемай праблеме «Жанрава-стылёвыя асаблівасці беларускай байкі» студэнткі 2-га курса Ганны Казлоўскай. Такі падыход падвышае прафесійную кампетэнцыю будучага выдаўца, бо выніковыя мэты звязаны з неабходнасцю прывіць студэнтам навыкі і ўменні разважаць, адстойваць свой пункт гледжання, умець аргументавана, з дапамогай уласнай кампетэнцыі пераконваць суразмоўцаў. Бо выдаўцам па роду заняткаў прыйдзецца пастаянна кантактаваць з аўтарамі, таму ім неабходна ўменне граматна весці прафесійную размову. На гэта нацэлены і дыспуты, і ўдзел у навуковых студэнцкіх канферэнцыях, і прафесійна-арыентаваныя сустрэчы.

Для пачаткоўцаў ладзяцца заняткі ў Літаратурным музеі, музеях Багдановіча, Янкі Купалы. З мэтай прафесійнай арыентацыі на сустрэчы запрашаюцца паэты, пісьменнікі, літаратуразнаўцы. Толькі за апошнія два гады гасцямі гуртка «Спадчына» былі супрацоўнік Інстытута літаратуры НАН Беларусі Я. А. Гарадніцкі, доктар філалагічных навук З. П. Мельнікава, доктар філалагічных навук І. Ф. Штэйнер, кандыдат філалагічных навук І. М. Гоўзіч, паэты Змітрок Марозаў, Вольга Коваль, Ніна Шклярава. А ў паэткі і літаратуразнаўца, дацэнта БДУ І.Э. Багдановіч гурткоўцы самі пабывалі ў гасцях на прэзентацыі новай кнігі паэзіі «Сармацкі альбом».

Студэнты другога курса займаюцца непасрэдным напісаннем творчых прац, падрыхтоўкай навуковых артыкулаў, тэзісаў для выступу на канферэнцыях. Напрыклад, толькі за мінулы навучальны год на IX Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў Беларусі (НДС-2004), якая праходзіла 26–27 мая 2004 г. у г. Гродна, з дакладамі выступілі В. Шамкуць і Я. Машкоўскі. Матэрыялы іх выступаў надрукаваны ў зборніку. На Рэспубліканскай канферэнцыі ў г. Мазары выступілі Людміла Цярэшка і Наталля Райчонак. Іх артыкулы таксама апублікаваны.

Звычайна тэмы даследаванняў выходзяць за рамкі вучэбнай праграмы, чым пашыраюць кругагляд і прафесійную кампетэнцыю будучага выдаўца. Напрыклад, студэнтка 4-га курса Вераніка Сапон даследавала тэму «Аналіз эзатэрычнай думкі К. Кастанэды», трэцякурсніца Лілія Шапялевіч – «Гістарычны раман Ю. І. Крашэўскага "Старое паданне"», а яе аднакурсніца Вераніка Швед тэмай свайго навуковага даследавання абрала асаблівасці развіцця амерыканскай літаратуры, першакурсніца Алена Каржуева заявіла тэму «Вобраз маці ў беларускай паэзіі XX стагоддзя».

Навуковыя даследаванні трэцякурснікаў і студэнтаў старэйшых курсаў, як правіла, удзельнічаюць у рэспубліканскіх конкурсах. Напрыклад, лаўрэатам III Рэспубліканскага конкурсу работ навучэнцаў і студэнтаў па грамадскіх навуках «Беларусь у сучасным свеце» ў мінулым годзе стала студэнтка Людміла Цярэшка. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі адзначыў яе творчую працу «Адметныя рысы паэзіі Ніны Загорскай» грашовай прэміяй і ганаровай граматай (III месца).

Праца студэнткі 4-га курса Вольгі Шамкуць «Жанр балады ў беларускім друку» у гэтым навучальным годзе заняла другое месца на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па прыродазнаўчых, тэх-

нічных і гуманітарных навуках. Удзел у Рэспубліканскім конкурсе прымае таксама даследаванне студэнткі 3-га курса Наталлі Райчонак «Станаўленне і развіццё беларускай элегіі». Да ўдзелу ў Рэспубліканскім конкурсе рыхтуюцца навуковыя працы студэнтаў 3-га курса Яўгена Машкоўскага «Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII–XVIII стст.)» і Барыса Забароўскага «Асаблівасці "магічнага рэалізму" Гарсія Маркеса ў рамане "Сто гадоў адзіноты"».

Актыўна і паспяхова ў творчую работу гуртка ўключыліся студэнты шостай і восьмай групаў першага курса. Напрыклад, студэнтка шостай групы Зоя Жэлдак абрала і ўжо паспяхова распрацоўвае тэму «Філасофскія і псіхалагічныя аспекты беларускай народнай казкі». Студэнтка не толькі склала падрабязны план будучай навуковай працы, але завяршае складанне спісу бібліяграфічных крыніц, затым яна пяройдзе да афармлення рэферата на заяўленую тэму. Безумоўна, заяўленая тэма складаная для першакурсніцы. Але студэнтка не навічок ў ёй. Яшчэ ў школе яна напісала працу па псіхалагічным успрыманні казак дзецьмі дашкольнага ўзросту. Гэты досвед Зоя Жэлдак імкнецца развіць і паглыбіць у абранай навуковай працы. Яе аднагрупніцы В. Пунтус, Т. Матруховіч, Т. Падалякава таксама вызначыліся ўдумлівай працай над абранымі тэмамі і ўжо завяршаюць напісанне рэфератаў.

Сур'ёзныя заяўкі на творчыя распрацоўкі зрабілі студэнты восьмай групы першага курса Ю. Іваноўская, В. Трусевіч, Ю. Камінская, якія ў сакавіку ўжо падрыхтавалі і абаранілі рэфератыўныя працы па заяўленых тэмах будучых навуковых даследаванняў.

Каб заахвоціць цікавасць студэнтаў да ўдзелу ў гуртку паглыбленага вывучэння літаратуры «Спадчына», імкнемся як мага часцей даваць яго ўдзельнікам адчуць радасць ад вынікаў сваіх намаганняў. Так, у бягучым навучальным годзе студэнтам 2-га курса спецыяльнасці «Выдавецкая справа» было прапанавана правесці навукова-практычную канферэнцыю «Ёсць у паэта свой аблог цалінны», прысвечаную 90-годдзю з дня нараджэння славутага беларускага паэта Аркадзя Куляшова. Арганізацыйны камітэт узначаліў студэнт 2-га курса шостай групы Максім Багатыроў. Прадуманая ім і васьмю членамі арганізацыйнага камітэта канферэнцыі праграма была творчай і дасканалай па сваім змесце, таму адказным выкладчыкам засталося толькі пагадзіцца з прапановай студэнтаў. А гэта: самастойная падрыхтоўка насценных газет, прысвечаных творчасці знакамітага паэта, нумары мастацкай самадзейнасці па куляшоўскіх творах, сцэнарый відэафільма, прысвечанага канферэнцыі, выпуск каляровай лістоўкі-рэкламы, адбор экспанатаў.

Члены аргкамітэта прымалі актыўны ўдзел і ў адборы лепшых дакладаў. Усяго ўдзел у ёй прынялі 22 чалавекі. Дамінавала ваенная тэматыка паэта, як даніна 60-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне. А лепшымі сталі даклады Кацярыны Амельяновіч «На вайне пра вайну», Ганны Казлоўскай «Пчалярская лексіка ў мове твораў Аркадзя Куляшова і ў вяцкай гаворцы беларускай мовы». Зацікавілі даклады Вікторыі Бялюк «Майстэрства перакладу А. Куляшова твораў рускай класікі», Ганны Мікуліч «Праяўленне гераічнага пафасу ў ваенных баладах і паэмах Аркадзя Куляшова», Вольгі Бычкоўскай «Касмічны матыў у паэзіі Аркадзя Куляшова». Відавочна, што правядзенне канферэнцый становіцца традыцыяй на факультэце, бо першакурснікі ўнеслі прапанову адзначыць стогадовы юбілей Петруся Броўкі.

Безумоўна, што найбольш клопату з пачаткоўцамі, якія, часам, аддаюць перавагу не ўдумліваму пошуку друкаваных літаратурных крыніц, а лёгкай «здабычы» матэрыялу для рэфератыўных прац з электронных носьбітаў. Але празмернае захапленне першакурснікаў Інтэрнэтам часам бракуе творчай працы. Бо, на жаль, да гэтага часу няма адзінай сістэмы бібліяграфічнага афармлення спасылак на электронныя матэрыялы. Нярэдка і інтэрнэт-публікацыі самі змяшчаюць недакладную інфармацыю, гэта тычыцца «перавыданняў» у электронным выглядзе літаратурных твораў па сусветнай літаратуры і крытычных матэрыялаў да іх. Напрыклад, згодна з электроннай версіяй, на дзесяць год памаладзілі Морыса Метэрлінка, на чатыры гады пазней падалі напісанне паэмы Байрана «Карсар». Таму сёння лепшым гурткоўцам прапаноўваюцца і тэмы крытычных аглядаў-аналізаў інтэрнэт-публікацый.

Пры кіраўніцтве гуртком «Спадчына» вызначальнай з'яўляецца тэма пра неабходнасць грунтаваць працу на сучасных методыках і тэхналогіях, якія павінны быць арыентаваны на інтэрактыўнасць. З гэтай мэтай праводзяцца:

– дыскусіі;

– абмеркаванні тэм;

– пачатковы навуковы пошук (пад кіраўніцтвам выкладчыка);

– конкурс творчых прац;

– прэзентацыя навуковага даследу на пасяджэнні гуртка, у акадэмічнай групе (часта не сваёй) і, нарэшце, на студэнцкай навуковай канферэнцыі БДТУ ці на канферэнцыях рознага ўзроўню ў іншых вузах;

– удзел у рэспубліканскіх і міжвузаўскіх канферэнцыях;

– удзел навуковых прац студэнтаў у рэспубліканскіх і прэзідэнцкіх конкурсах.